# Петр Иосифович ЗЕЛИНСКИЙ

# Пётр Іосіфавіч ЗЯЛІНСКІ

# Pjotr Iosifavich ZJALINSKI



Пайшоў з жыцця 15 ліпеня 2019 г. на 88-м годзе беларускі гісторык, доктар гістарычных навук, прафесар кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Пётр Іосіфавіч Зялінскі.

Вядомы ў Беларусі і за яе межамі гісторык нарадзіўся 31 снежня 1931 г. у в. Заканалле Люблінскага ваяводства (Польская Рэспубліка) у беларускай сялянскай сям'і. У 1950 г. пасля заканчэння Астрамечаўскай сярэдняй школы Брэсцкага раёна Пётр Іосіфавіч паступіў на гістарычнае аддзяленне Брэсцкага настаўніцкага інстытута. Пасля атрымання педагагічнай адукацыі ў 1952 г. пачаў працаваць у Залескай сямігадовай школе. У снежні 1952 г. ён быў прызваны ў шэрагі Савецкай арміі. Першапачаткова службу праходзіў у г. Жыткавічы ў 47-й артылерыйскай брыгадзе, дзе вялася падрыхтоўка афіцэраў запасу. У пачатку ліпеня 1954 г. батарэю, у якой служыў Пётр Іосіфавіч, разам з тэхнікай накіравалі на Тоцкі вучэбна-артылерыйскі палігон у Чырванасцяжную Прыволжска-Уральскую ваенную акругу, дзе яе асабовы склад павінен быў прыняць удзел у вопытна-паказальных вучэннях з прымяненнем атамнай зброі. У момант выпрабавання атамнай бомбы 14 верасня 1954 г. Пётр Іосіфавіч Зялінскі знаходзіўся ў бліндажы назіральнага пункта, які размяшчаўся ўсяго за 2 км ад эпіцэнтра выбуху.

Пасля праходжання службы і вяртання на радзіму Пётр Іосіфавіч амаль дзесяць гадоў – з 1954 па 1963 г. – працаваў дырэктарам Залескай сямігадовай, Баршчэўскай і Высокаўскай сярэдніх школ Камянецкага раёна Брэсцкай вобласці. Паралельна ён атрымліваў вышэйшую адукацыю. У 1958 г. скончыў гістарычны факультэт Гомельскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута. У 1965 г. у жыцці Пятра Іосіфавіча адбыліся значныя змены, якія прадвызначылі яго далейшы прафесійны рост: ён паступіў у аспірантуру Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Ужо ў 1969 г. П. І. Зялінскі абараніў кандыдацкую дысертацыю «Роля друку Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі ў мабілізацыі працоўных мас на барацьбу за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне ў гады сусветнага эканамічнага крызісу капіталізму (1929–1933 гг.)». З моманту паступлення ў аспірантуру амаль усё далейшае жыццё Пятра Іосіфавіча было звязана з БДУ.

Спачатку П. І. Зялінскі працаваў выкладчыкам, старшым выкладчыкам кафедры гісторыі КПСС прыродазнаўчых факультэтаў БДУ. У 1970 г. яго запрашаюць працаваць інспектарам аддзела выкладання грамадскіх навук у Міністэрстве вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР, але ўжо ў 1973 г. Пётр Іосіфавіч вярнуўся ў БДУ, дзе працаваў старшым выкладчыкам, дацэнтам, а з 1989 г. – загадчыкам кафедры гісторыі КПСС прыродазнаўчых факультэтаў. Паралельна П. І. Зялінскі займаўся навуковай працай, вынікам якой стала паспяховая абарона ў 1989 г. доктарскай дысертацыі «Палітычная работа Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі ў масах (1923–1938 гг.)». У 1991 г. Пётр Іосіфавіч атрымаў вучонае званне прафесара. З 1993 г. П. І. Зялінскі працаваў прафесарам кафедры гісторыі Беларусі, а з 1994 да 2017 г. – прафесарам кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу гістарычнага факультэта БДУ.

Навуковыя інтарэсы П. І. Зялінскага былі даволі шырокія: гісторыя Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд, навейшая гісторыя Беларусі, удзел беларусаў

CC BY NC

у стварэнні і выпрабаванні ядзернай зброі. З-пад пяра Пятра Іосіфавіча выйшла некалькі манаграфій, «Палітычная работа КПЗБ у масах: 1923–1938 гг.» (1986) («Друк КПЗБ у барацьбе за свабоду» (1994; у сааўтарстве)), шматлікія вучэбныя дапаможнікі для студэнтаў – усяго звыш 60 публікацый. Пад непасрэдным навуковым кіраўніцтвам Пятра Іосіфавіча 12 аспірантаў падрыхтавалі і паспяхова абаранілі кандыдацкія дысертацыі.

Вельмі шмат было зроблена П. І. Зялінскім дзеля захавання памяці аб ветэранах падраздзяленняў асаблівай рызыкі. Па яго ініцыятыве быў праведзены шэраг навуковых канферэнцый, прысвечаных гадавінам вучэнняў на Тоцкім вучэбна-артылерыйскім палігоне. Выпрабаванні і далейшы лёс таварышаў па службе быў разгледжаны на старонках кніг, якія выйшлі пры непасрэдным удзеле Пятра Іосіфавіча: «Атомные солдаты Беларуси: воспоминания» (2003), «Книга памяти ветеранов подразделений особого риска города Минска» (2008), «Атомные солдаты: книга памяти ветеранов подразделений особого риска Минской области» (2012).

За значныя дасягненні ў навуковай, педагагічнай і грамадскай працы Пётр Іосіфавіч быў узнагароджаны медалём «Ветэран працы», Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, граматамі міністэрстваў і ведамстваў, грамадскіх арганізацый і ўстаноў Рэспублікі Беларусь. У 2011 г. ён быў удастоены ганаровага звання «Заслужаны работнік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта».

У жыцці Пётр Іосіфавіч заўсёды заставаўся вельмі сціплым і простым у зносінах чалавекам. За навуковы ўклад, чалавечыя якасці і дабрыню П. І. Зялінскага вельмі паважалі яго вучні, студэнты, аспіранты, выкладчыкі і супрацоўнікі гістарычнага факультэта БДУ, іншых вучэбных і навуковых устаноў, з якімі супрацоўнічаў Пётр Іосіфавіч Зялінскі. Калегі заўсёды адчувалі яго душэўную цеплыню, цанілі яго веды, тонкі народны гумар, жыццярадаснасць.

Калектыў гістарычнага факультэта БДУ, калегі па кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу глыбока смуткуюць з прычыны смерці прафесара Пятра Іосіфавіча Зялінскага і выказваюць шчырыя спачуванні яго родным і блізкім.

***А. Г. Каханоўскі*[1], *В. С. Макарэвіч*[2]**

[1]*Александр Геннадьевич Кохановский* – доктор исторических наук, профессор; декан исторического факультета Белорусского государственного университета.

*Аляксандр Генадзьевіч Каханоўскі* – доктар гістарычных навук, прафесар; дэкан гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*Aliaksandr G. Kakhanouski*, doctor of science (history), full professor; dean of the faculty of history, Belarusian State University.
E-mail: *kohanovsky@bsu.by*

[2]*Виталий Сергеевич Макаревич* – кандидат исторических наук, доцент; заведующий кафедрой истории Беларуси нового и новейшего времени исторического факультета Белорусского государственного университета.

*Віталь Сяргеевіч Макарэвіч* – кандыдат гістарычных навук, дацэнт; загадчык кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*Vitaly S. Makarevich*, PhD (history), docent; head of the department of and modern and contemporary history of Belarus, faculty of history, Belarusian State University.
E-mail: *witalij@tut.by*